

image
THE WALKING DEAD
43
$2.99
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
Хадзячыя мерцвякі
№43 (2003)
пераклад
і афармленне:
Козыраў Сяргей
KIRKMAN • ADLARD • RATHBURN

IMAGE COMICS PRESENTS

THE WALKING DEAD™

ROBERT KIRKMAN
Creator, Writer

CHARLIE ADLARD
Penciler, Inker, Cover

CLIFF RATHBURN
Gray Tones, Cover Colors

RUS WOOTON
Letterer

SINA GRACE
Editor

Previously:

The Governor and the forces of Woodbury arrived at the gates of the prison--ready for a fight! But how did he survive his toture at the hands of Michonne?

THE WALKING DEAD WEEKLY #43. October 2011. Published by Image Comics, Inc. Office of publication: 2134 Allston Way, 2nd Floor, Berkeley, CA 94704.


Што наконт той дзеўкі?
Гак з ёй. Цяпер яна па-за зонай бяспекі – у яе няма шансаў.
А што наконт яго?


Ён мёртвы?


ААНГХ!
Аааа!
Ну яе ў дупу! Цяпер яна дакладна на кулю напрасілася...
Нххх!
Не!
Не чапай...
Не чапай яе...
Не...
Клосціць мяне ў вочы! Ён жывы!
Халера, Брус... Док і Эліс **уцеклі**! Што ж нам цяпер рабіць?!


Рабяты, вы пакуль зачыніце гэтае маленькае лайно ў іншым пакоі. А я збегаю ўніз і прыцягну Боба.
Боба? Гэтага чортавага алкаша, што ўвесь час сядзіць унізе пад дзвярыма? Якога гака ён можа зрабіць?
Верагодна і **ня шмат**... але значна больш, чым любы з нас.
Проста зачыніце гэтую высяруху!
Боб!
Уставай, патрэбна твая дапамога!
Наверх!
ХУТКА!
Што?! Навошта?!
Ты жа быў вайсковым лекарам, так?!
Усяго два тыдня, сорак сраных гадоў назад!
Я нічога не ўмею.
Што ж... Хаця б, курвіска, паспрабуй.
Губернатар клапаціўся аб табе... Прыглядваў, каб ты заўсёды быў сыты, і не ўпіўся да смерці... І зараз, ты можаш вярнуць яму абавязак.


Я зачыніў дзеўку і перавязаў яго руку.
Ён у непрытомнасці... але ўсё яшчэ дыхае.
Окей, Боб... Ты хочаш, каб я...
Гамон!
БУЭЭЭЭ!
Не магу...
Нават глядзець на яго не магу.
Я нічога не змагу зрабіць.
Док і Эліс уцеклі! Калі ты нічога не зробіш, ён, курвіска, ЗДОХНЕ!
ТЫ ХОЧАШ, КАБ ЁН ПАМЁР?!


Я не...
Не.
Тады, лайнюк, зрабі што-небудзь!
Мне спатрэбяцца чыстыя бінты... і перакіс. Нам трэба перанесці яго ў лазарэт.
Зраблю ўсё, што змагу.


Колькі?
Колькі ты быў у непрытомнасці? Амаль тыдзень. Часам ты прыходзіў у сябе... але не думаю, што ты памятаеш што-небудзь.
Вы знайшлі дока Стывенса? Прымусілі яго падсілкаваць мяне?
Неа. Док загінуў. Яго цела знайшлі, калі пайшлі на пошукі гэтай курвіскі і яе сябрукоў. Іх не знайшлі... але яго цела было прама пад агароджай, з іншага боку.
Не доўга ён пабыў уцекачом.
Туды лайнюку і дарога.
Дык, калі дока няма... якога гака я не памёр?



Боб.
Боб?
Гэта ж смешна. Ды гэтаму старому алкашу і лініі прама не правясці... не тое каб мяне падлячыць. Ён адмовіўся быць асістэнтам дока... Таму яму стала дапамагаць гэта чортава дзеўка.
Да шчасця, яму рабіць асабліва нічога не прыйшлося. Ён сказаў, што з рукой і так усё добра - агонь яе як след прадэзынфіцыраваў, а вось з усім астатнім яму прыйшлося папрацаваць.
Калі яна адрэзала твой... эээ... Боб сказаў, што надрэз на сцягне не пашкодзіў галоўную артэрыю, таму страта крыві не была такой ужо значнай. Хаця, калі б яна зачапіла яе, гэта б напэўна цябе забіла.
Інфекцыя амаль дабралася да вока, але мы паспелі ў час.
Ён кажа, яна была вельмі асцярожна. Ён лічыць, яна хацела, каб ты заставаўся жывым... што ў яе, быццам, былі яшчэ планы на цябе.
Планы на мяне?! Паглядзім, што скажа Марцінэз.
Я магу напісаць цэлую чортаву кнігу аб тым, што я планаваў для яе.
Э-э... Марцінэз ушоў з імі.
Ды ведаю я, курвіска, што ён ушоў з імі. Я ня ведаў, што док і яго шлёндра ўйдуць... Але гэта быў мой план.
Марцінэз дапамагае ім збегчы... А потым вяртаецца і расказвае нам, дзе дакладна знаходзіцца гэтая турма.
Калі я быў у адключцы тыдзень... тады ён можа вярнуцца ў любы момант. І тады, гэтая сука **мая**!



Няўжо ня бачыш, што я заняты?
Прабачце, што перашкодзіў...
Вы прасілі паведаміць, як толькі мы знойдзем Марцінэза.
Мы знайшлі яго.
Ён мёртвы.
=уздых=
Мяркую, прыйшоў час пагутарыць з людзьмі.



Прабачце за доўгі час адсутнасці. Ведаю, за гэты час узніклі некаторыя грамадска-значныя пытанні, з якімі я быў не ў стане разабрацца. І я прашу прабачэння за гэта.
Хутка гульні ўзнавяцца і працягнуцца... Але, як вы ўжо напэўна заўважылі, гледзячы на мяне, у мяне былі больш важныя справы.
Як вы ведаеце, доўгі час у горад не прыходзілі новыя людзі, і нядаўна, калі мы знайшлі невялікую купку выжылых, я вельмі ўзрадаваўся.
Я меркаваў, што яны так сама, як і мы, радыя, што засталіся ў жывых, і ўдзячны лёсу, што сустрэлі іншых выжылых, але гэта аказаўся не той выпадак.
У гэтым свеце існуе зло... І не ўсё яно прымае форму гэтых непахаваных монстраў, што ходзяць за нашай агароджай.
Спачатку, я ўявіць сабе не мог, на што яны здольны. Я паверыў ім... і гэта стала вялікай памылкай.
Ім былі патрэбны харчы, якіх у нас аказалася шмат. Іх суполка жыве ў турме недалёка адсюль, і яны ўзялі з сабой нашага кіраўніка бяспекі. Марцінэз пайшоў з імі, каб яны паказалі яму гэтае месца.
У нас была размова аб аб'яднанні нашых лагероў... у адну суполку, якая б жыла ў самым абароненым месцы.
Некаторыя з іх засталіся... і аднойчы ноччу, калі мая ахова адпачывала, яны схапілі мяне, каталі... знявечылі... і кінулі паміраць.
У іх атрымалася збегчы... але па дарозе яны забілі доктара Сцівенса. Гэта жорсткія, бязлітасныя дзікуны!
Я баяўся за жыццё Марцінэза... Я не ведаў, ці ўзялі яны яго ў палон, ці яшчэ што горш. І перш, чым мы арганізавалі пашуковы атрад... мы нешта знайшлі каля варотаў...


ГЭТА!
Ведаю, ніхто з вас не жадаў гэтага бачыць, прабачце, што напужаў.
Я проста хацеў, каб вы канчаткова зразумелі, што тыя людзі, з якімі мы маем справу - гэта...
Пачвары!


Гэтыя дзікуны ведаюць, дзе мы жывем! Яны ведаюць, што ў нас ёсць! Ведаюць нашыя моцныя і слабыя бакі!
Мы павінны напасць на іх перш, чым яны прыйдуць сюды!
Я не складу рукі і не дам ім знішчыць нас... Толькі не пасля таго, праз што нам прыйшлося прайсці... Не пасля таго, як нам прыйшлося столькім ахвяраваць!
Мы вельмі шмат працавалі, каб пабудаваць тое, што ў нас цяпер ёсць...
І няхай я буду ПРАКЛЯТЫ, калі дам камусьці забраць усё гэта ў мяне!
Так, чорт цябе бяры!
Сапраўды, курвіска!
Рады, што вы лічыце так сама.
...але павінен жа тут быць хоць хтосьці, хто хаця б трохі знаёмы з гэтай мясцовасцю. Калі такія ёсць... калі ласка, паведамьце мне.
Спачатку нам трэба знайсці іх. Ведаю, большасць тых, хто жыў у гэтых месцах, уйшлі ў Атланту, калі ўлады сказалі нам памкнуцца ў буйныя гарады...
Турма, у якой яны знаходзяцца, мабыць, як у пяці, так і ў пяцідзесяці мілях ад нас... І мы нават ня ведаем, у якім накірунку. Гэта будзе не проста.
Але гэта трэба зрабіць... яны павінны быць пакараны.


гаахааа.
BLAM!
Якога гака, так доўга?!
Гэта не той выпадак, калі трэба спяшацца, бос. Тут вельмі шмат людзей, якія хочуць накіравацца на пошукі... І нам трэба даць некатовым з іх пайсці ў іншым напрамку, калі канешне вы не хочаце ім расказаць, дзе мы знайшлі Марцінэза перш, чым адрэзаць яму галаву.
Ніхто не можа нам нічога сказаць акрамя таго, што тут калісьці была турма - дзесьці ў раёне Макалістар Лэйн. А гэта неверагодна доўгая дарога, і мы не можам яе даследаваць з-за кінутых на ёй машын... І чалавек, які даў нам гэтую інфармацыю, нават не ўпэўнены, што турма стаіць менавіта на гэтай дарозе.
Вельмі шкада, сэр. Мы робім усё, што можам. Мы стварылі некалькі атрадаў, яны выходзяць кожны дзень... і складаюць мапу мясцовасці.
Мы добра вывучылі акругу... але ўсё роўна так і не змаглі знайсці гэтую чортаву турму.
BLAM!
Лайно!
Якога чорта гэтая сука адрэзала мне менавіта правую руку? Цяпер з пісталета ніяк патрапіць ні ў каго не магу.



Чорт... Стой, супакойся.
Ведаю, хутчэй за ўсё цябе гэта наўрад ці задавальняе, але спадзяюся, ты разумееш, наколькі ўсё стане прасцей.
Гэта сапраўды палепшыць нашыя ўзаемаадносіны.
Ну вось, яшчэ адзін... Ужо значна лягчэй.
Ангх.
Вось.
Бачыш? Ня так ужо і дрэнна... Ты ўжо амаль абвыкла да гэтых адчуванняў, так?
Яшчэ парачку і ўсё.
Вось так. Гатова... Зусім іншая справа.
А цяпер хадзі сюды.



Пацалуй татулю.


БУЭЭЭЭ!
О, мілая... Прабач... Не падумай нічога такога.
Упэўнены, з часам я звыкну да густу.
Не расчароўвайся з-за..
KNOCK! KNOCK!
Курвіска!
Няўжо я не папярэджваў, каб мяне не турбавалі?
Прабачце, бос. Нешта здарылася.
Адбыўся выбух, мы лічым, што падарвалася на базе Нацыянальнай гвардыі... Вялізны слуп дыму падымаецца ў неба.
Брус узяў некалькі хлопцаў і паехаў разбірацца... Праз некалькі хвілін пасля таго, як яны ўехалі, мы пачулі стрэлы недзе непадалёк.
Непадалёк? Тады проста заскоквай у машыну і... **Курвіска!**
Хадзем за мной.



WAL★MART
Піпец!
Божа.
Галава не пашкоджана, мабыць ён яшчэ жывы.
Ангх...
Лысы сучонак...
Яны вярнуліся...
Яны...


Брус.
БРУС!!!
BLAM!
Яны толькі што былі тут.
Знайдзіце іх гробаныя сляды. Знайдзіце іх гробаную турму.
Зараз жа!



Гэта пытанне веры, мілая.
Мая вера ніколі не была настолькі моцнай, як зараз.
Ох, бацька...
Добра, досыць заняткаў у васкрэснай школе... Давайце паглядзім, як хутка вы зможаце зачысціць гэтую тэрыторыю.
BLAM! BLAM! BLAM!
Што яны зараз робяць?
Ня ведаю, проста перасталі страляць. Пачакай... Яны схапілі аднаго кусаку, праўда, ня ведаю, навошта... Цягнуць яго назад у...
Яны ўзялі яго з сабой... Прыцягнулі гэта чортава стварэнне ўнутр.
Псіхапаты чортавы.
Ага.
Пойдзем, пакуль іх увага адцягнута... Вернемся назад і скажам Губернатару, што знайшлі іх.
Не хачу застацца тут, калі ўжо будзе цёмна.



У іх там плот... І яны дазваляюць кусакам тоўпіцца ўздоўж усяго перыметра гэтага плота, мабыць і не спецыяльна... А можа яны ўсё ж такі больш кемлівыя, чым мы лічылі.
Мы назіралі за імі напрацягу гадзіны. Калі мы нападзем на іх заўтра, яны абсяруцца. Наўрад ці яны палезуць у бойку.
Іх там не так ужо і шмат, і ў іх не можа быць шмат зброі... Пасля таго, як мы амаль усё забралі з вайсковай базы.
Не.
Мы пачакаем.
Чорт бяры, Губер! Пасля таго, што яны зрабілі з Брусам!?
Нам патрэбна пакараць іх зараз жа!
Прабач?
Пасля ўцёкаў... Яны былі напагатове напрацягу многіх тыдняў. Але мы не маглі знайсці іх.
Пасля таго, як Марцінэз здрадзіў ім... І яны забілі яго - яны зноў напагатове.
Цяпер яны забралі нашыя харчы і забілі некалькіх нашых. Яны чакаюць ад нас, што мы паедзем за імі. Але мы пачакаем... яшчэ тры тыдні. Мабыць чатыры.
І тады, калі яны не будуць нас чакаць, калі страцяць уважлівасць... Пераканаюць сабе, што яны ў бяспецы... Што мы склалі зброю...
Вось тады мы і нанясем удар... І калі ты хочаш дажыць да гэтага моманта і пасці з намі ў атаку, а не ператварыцца ў смярдзючую яжу для кусак, запхні свой брыдкі рот і знікні да халеры з вачэй маіх.
Прэч.



Я хутка вярнуся. Не турбуйся, мілая.
Я так хутка вярнуся, што ты нават не паспееш засумаваць. Паводзь сябе добра з дзядзькай Бобам, добра?
Ведаю... Я таксама люблю цябе.
Упэўнены, што зладзіш? Я сур'ёзна... Яна для мяне шмат значыць.
Зладжу. Я цвярозы... з таго часу, як выратаваў тваё жыццё. Я прыгляджу за ёй.
Можаш даць ёй пагуляць, калі хочаш, але я не буду на цябе крыўдзіцца, калі заставіш яе прывязанай. Яна ўжо не можа ўкусіць, але ўсё яшчэ можа нарабіць шкоды... А ў нас зараз няма нічога, чым мы маглі б яе падсілкаваць.
Але калі хто-небудзь памрэ... Усё роўна, хто... Прасачы, каб яна атрымала пачастунак.
Добра?
Так.
Добра.



Сябры, мы знайшлі іх.
Яны пазбавілі жыцця дока Сцівенса, забілі Бруса Купера, знявечылі мяне... І цяпер, прыйшоў час заплаціць ім за гэта.
ПА МАШЫНАХ!




Мы так блізка, што можам адчуць пах зла.
Паспрабуйся трымацца на адным узроўні з танкам, мы набліжаемся. Я хачу, каб мы былі падобны на непераможную хвалю, якая накатваецца з-за гарызонту. Зараз нам патрэбна напужаць іх так, каб яны ў штаны насерылі.
Калі ўсё пачнецца, не дайце іх вы-гляду сябе падмануць. Вы ўбачыце жанчын... нават дзяцей, але будзьце ўпэўненыя, гэтыя людзі - пачвары, такія ж, як кусакі, якіх мы забіваем не раздумваючы.
Жыццё ў гэтым месцы... Яно змяніла іх, ператварыла ў істот, якія забіваюць без аніводных сумненняў... Яны ні ў грош не каштуюць чалавечае жыццё.
Яны не заслугоўваюць таго, каб жыць.
Далучайся да ланцуга разам з астатнімі.
Вы што, застаецеся?
Я не прапушчу гэта ні ў якім разе.
Я паеду на танку.
Паехалі.






ЗАБІЦЬ ЇХ УСІХ!